з альтэрнатыўнымі выдавецкімі арганізацыямі, знаўшы бюракратычныя бар'еры і зрабіўшы льготным падаткаабкладанне.

## МІЖАСОБНЫЯ ЗНОСІНЫ ПАДЛЕТКАЎ ЯК ЧЫТАЧОЎ

С.А.Паўлава

Даследаванні, якія былі праведзены ў апошні час, навуковымі калектывамі псіхолагаў, далі пераканаўчыя даныя аб рашаючым уплыве бліжэйшага сацыяльнага акружэння (сям'і, педагогаў, равеснікаў) на фарміраванне асабістых якасцей падлеткаў. Значная, калі не большая частка педагагічнага ўплыву, розных выхаваўчых інстытутаў, рэалізуецца ў групавых камунікатыўных сітуацыях, і зносіны значна узнімаюць, альбо наадварот зніжаюць эфектыўнасць гэтага ўздзеяння.

Сацыяльныя сувязі старэйшых падлеткаў носяць як бы дваісты характар: сувязі з сацыяльнай рэчаіснасцю, апасрэдаваныя дарослымі, і непасрэдныя сацыяльныя сувязі і адносіны ўнутры ўзроставай групы, сярод равеснікаў. Пры гэтым у падлеткавым узросце большае значэнне маюць зносіны ўнутры ўзроставай групы.

Вынікі цэлага шэрага бібліятэказнаўчых даследаванняў сведчаць аб значнай ролі міжасобных зносін у чытацкай дзейнасці падлеткаў. Сярод розных каналаў інфармацыі аб кнізе і чытанні значнае месца займаюць зносіны з равеснікамі.

Эфектыўнасць зносін з равеснікамі заключаецца перш за усё ў тым, што яны з'яўляюцца крыніцай узнікнення пазнавальнага інтарэсу, яго фарміравання і ўмацавання. Вядома, што ў працэсе зносін падлеткі атрымоўваюць значную частку ўсей пазнавальнай інфармацыі.

У сучасным бібліятэказнаўстве праблема ўплыву міжасобных зносін на чытанне падлеткаў знаходзіцца ў пачатковай стадыі распрацоўкі. Існуючыя даследаванні адлюстроўваюць гэту праблему толькі часткова, у асноўным у плане пастаноўкі пытання і абгрунтавання яго актуальнасці.

У сацыяльнай псіхалогіі найбольш часта выдзяляюцца наступныя бакі зносін, якія характарызуюць яго структуру: камуніка-

тыўны (абмен інфармацыяй паміж індывідамі), інтэрактыўны (арганізацыя ўзаемадзеяння паміж індывідамі), перцэптыўны (працэс успрымання індывідаў адзін аднаго). Так як мы разглядаем зносіны ў вобласці чытання, значыць іх азначальным момантам з'яўляецца камунікатыўны бок зносін.

Пад міжасобнымі зносінамі падлеткаў як чытачоў, якія ўключаны ў сумесную пазнавальную дзейнасць ва ўмовах школы і бібліятэкі, мы разумеем абмен інфармацыяй аб творах друку, расказ аб прачытаным, прамую або ўскосную рэкамендацыю кніг і часопісаў для чытання.

Наша даследванне дазволіла вылучыць некаторыя характэрныя рысы міжчытацкіх зносін падлеткаў. Даследванне паказала, што 92% падлеткаў пастаянна абменьваюцца з равеснікамі ўражаннямі аб прачытаным. Гэтай тэмы не тычацца толькі 8%.

На пытанне "Збіраецеся Вы расказаць сваім сябрам аб тых кнігах, якія Вам спадабаюцца і якія былі прачытаны за апошнія два тыдні?" 58% адказалі, што раскажуць абавязкова; 30% – раскажуць, калі ўзнікне размова з равеснікамі аб тым, хто і што прачытаў за апошні час. Усяго 10% чытачоў адказалі, што хутчэй за ўсе расказваць не будуць.

Па нашаму назіранню, дзяўчаты некалькі часцей за юнакоў вядуць размову аб прачытаным. Для блізкіх сяброваў натуральны абмен меркаваннямі аб усіх кнігах, якія яны чытаюць. Увогуле дзяўчатам уласціва расказваць сябрам аб кнігах адразу ж пасля іх чытання.

Юнакі часцей імкнуцца абдумаць тое, што прачыталі, скласці асабістае ўражанне і толькі затым даведацца, што гавораць іншыя. Для юнакоў характэрна больш глыбокая арыентацыя на агульнагрупавыя інтарэсы ў міжасобных зносінах. Таму вельмі часта яны расказваюць равеснікам толькі аб тых кнігах, якія спадабаюцца субяседнікам. Гэтым, у нейкай меры, можна растлумачыць тое, што юнакі некалькі радзей дзяўчат падзяляюцца з равеснікамі сваімі ўражаннямі аб прачытаным.

Асновай міжчытацкіх зносін з'яўляецца эмацыянальны кантакт, які дазваляе знайсці спосаб больш поўнага самавыражэння, выкарыстаць ускосны жыццевы вопыт у распрацоўцы і фарміраванні індывідуальных і групавых прынцыпаў, навыкаў паводзін, норм ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ралі і г.д. Гэта паказау аналіз зместу міжчытацкіх зносін вучняу і асноуных сітуацый, у якіх яны здзейсняліся.

Юнакі і дзяучаты назвалі самыя разнастайныя сітуацыі, у якіх праходзілі гутаркі аб кнігах. Часцей за усе яны узнікалі у школе, на перапынках, або пасля урокау па дарозе дамоу. Многія апытаныя адказалі, што часта гаварылі аб кнігах з сябрамі і дома. Гутаркі узнікалі пры сумесных прагулках, у двары, па тэлефоне, у бібліятэцы. Так, 66% вучняу часта прыходзяць у бібліятэку абменьваюць кнігі разам з сябрамі.

Характэрна, што у большасці выпадкау абмеркаванне прачытанага было цесна звязана з рознымі тэмамі размовы юнакоу і дзяучат. Такія гутаркі узнікалі пры абмеркаванні важных жыццевых праблем, з'яу дня або нядаунягя мінулага, новых навуковых адкрыццяу і г.д.

Старэйшыя падлеткі часта выкарыстоуваюць прыклады з прачытанага для пацвярджэння думак, форм паводзін, учынкау як сваіх асабістых, так і іншых людзей.

Прыклады ілюструюць сітуацыі і змест міжчытацкіх зносін, калі яны узнікаюць і непасрэдна падпарадкоуваюцца абмеркаванню розных жыццевых праблем. Удзельнікі гутаркі успамінаюць кнігі і артыкулы, якія чыталіся раней і па свайму зместу сходныя з тэмай размовы. Поводам для гутаркі нярэдка з'яуляецца абмеркаванне прачытанай кнігі. Прадметам размовы становіцца яе змест, асноуныя праблемы якія старшакласнікі часта параунoуваюць з рэальным жыццем, са сваімі учынкамі.

Часта пры абмеркаванні канкрэтнай кнігі у удзельнікау зносін актывізуецца асацыятыуная памяць, узнікае жаданне расказаць аб кнізе, яшчэ не знаемай іншым. Такім чынам у гутарку далучаюцца успаміны аб розных кнігах, адбываецца абмен інфармацыяй аб прачытаным. Пры гэтым можа узнікнуць больш ці менш працяглы інтарэс да акрэсленай тэмы або аутара. Аналіз назвау творау друку, якія абмяркоувалі старшакласнікі у час апыту, паказвае, што асноуную частку складае мастацкая літаратура - 85%. Доля навукова-галіновай літаратуры складае 15%. Мастацкія творы замежных пісьменнікау складаюць 25%.

Зусім не абмяркоуваюць творы рускіх дарэвалюцыйных пісьменнікау.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падлеткі аддаюць перавагу у гутарцы прыгодніцкай літаратуры, кнігам маладзежнай тэматыкі. Прыкметна, што творы навуковай фантастыкі займаюць у ліку абмяркоўваемых кніг амаль апошняе месца, між іншым чытаюць іх значна актыўней. Гэта можна тлумачыць тым, што юнацтва імкнецца, перш за усе, да пазнання навакольнага жыцця, верагоднага вопыту сталых пакаленняў, бліжняй жыццевай перспектывы, і кнігі па гэтым праблемам абмяркоўваюць у першую чаргу.

Неабходна падкрэсліць, што тэматыка мастацкіх твораў, якая абмяркоўваецца вучнямі, паказвае ролю міжчытацкіх зносін юнацтва. Яны арганічна уваходзяць у працэсы фарміравання маральных норм.

Як ужо гаварылася, колькасць кніг навукова-галіновай тэматыкі невялікая. На наш погляд, гэта выклікана тым, што:

1. Мастацкая літаратура паказвае усю разнастайнасць жыцця, нясе у сабе багаты вопыт многіх пакаленняў, навучае эстэтычнаму успрыманню наваколля. Усе гэта даказвае яе значнасць у міжчытацкіх зносінах падлеткаў.

2. Міжчытацкія кантакты асабліва лёгка і проста адбываюцца пры арыентацыі тых, хто уступіў у зносіны, на іхнія асноўныя чытацкія інтарэсы. Такія кантакты адбываюцца прасцей усяго пры абмеркаванні мастацкай літаратуры;

3. Звычайна падлеткі падзяляюцца з равеснікамі ужо засвоенымі ведамі, якія атрымалі з кніг галіновай тэматыкі і рэдка называюць крыніцы атрымання гэтых ведаў.

Аднак пералічаныя прычыны не выключаюць неабходнасці павялічваць колькасць навукова-галіновых кніг у міжчытацкіх зносінах падлеткаў. Бібліятэкары павінны з вялікай адказнасцю падыходзіць да адбору кніг і артыкулаў, якія прапануюць падлеткам, улічваючы перш за усе праблемнасць зместу гэтых кніг, цікавы выклад, уменне аўтара даступна пазнаёміць чытача з праблемамі навукі.

Міжчытацкія зносіны старэйшых падлеткаў у большасці выпадкаў носяць характар дыскусіі.

Падлеткі даволі часта рэкамендуюць адзін аднаму кнігі для чытання. На гэта указалі 73% апытаных. Відавочна, што матывамі рэкамендацыі з'яўляюцца не толькі жаданне пазнаць меркаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сяброў аб кнізе, але і імкненне кіравац.. чытаннем сяброў.

Такім чынам, міжчытацкія зносіны з равеснікамі выконваюць наступныя задачы: садзейнічаюць рэалізацыі жадання ў вусным кантакце з равеснікамі; з'яўляюцца асноўным спосабам выпрацоўкі агульнага меркавання аб прачытаным; з'яўляюцца важным каналам распаўсюджання і атрымання разнастайнай інфармацыі аб творах друку.

Змест міжчы.. якіх зносін адлюстроўвае асноўную тэматыку чытацкіх інтарэ.. юнацтва, у лік кніг уваходзяць вострапраблемныя, якія вы..ваюць спрэчкі і абмеркаванні. Міжчытацкія зносіны характэры..юцца высокай ступенню дыскусійнасці.

## ЗН..СТВА З КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦЕМ БЕЛАРУСКАГА ЗАМЕЖЖА

Л.А.Дзямешка

Палон ідэалагічных догмаў на мноства гадоў засланіў ад нас актыўнае культурнае жыццё нашых суродзічаў за мяжой – беларускую дыяспару. Магчыма, такое становішча растлумачваецца тым, што да апошняга часу ў нас існавалі варожыя адносіны да усіх тых, хто не займаў прасавецкую пазіцыю і не гучна хваліў нас за "палітычныя і эканамічныя поспехі". І толькі цяпер пачаем паварочвацца да нашых суайчыннікаў і адкрываем для сябе цэлы свет беларускага жыцця за мяжою – цікавы, рознастайны, здольны нас многаму навучыць.

Найбольш нацыянальна свядомыя і адукаваныя людзі – эмігранты стварылі за мяжой беларускія культурныя цэнтры ў Амерыцы, Канадзе, Англіі, Германіі, Аўстраліі. Яны выдалі мноства кніг, перыядычных выданняў, якія ўяўляюць сабой грун..оўную краіназнаўчую базу не толькі па гісторыі беларускай э..іграцыі, але і наогул па гісторыі Беларусі. Гэта частка і гістарычнай і культурнай спадчыны нашага народа. З найбольш значных – 19 тамоў "Запісаў" Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Амерыцы, біяграфія Я.Купалы і Я.Коласа, бібліяграфія Скарыніяны, "Слоўнік" Янкі Станкевіча, "Беларуская мова" ў 2-х тамах В.Пашкевіч. У тых жа "Запісах" апублікаваны артыкулы па гісторыі Беларусі,